“Метамарфозы–2018”: у пошуках ідэй

Кабель ад тэлевізара, мех з-пад морквы, кавалак плінтуса — гэта не вопіс хламу з кладоўкі, а калекцыя маладога дызайнера. У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка трэці раз прайшоў фестываль авангарднай моды і стылю “Метамарфозы”. Будучыя настаўнікі і выхавальнікі паспрабавалі перадаць праз касцюмы свае ўражанні ад архітэктуры, жывапісу, літаратуры і г.д. Як апрануць мадэлей у самы папулярны серыял сучаснасці і нафарбаваць па кнізе Льюіса Кэрала, расказалі самі дызайнеры.







За кулісамі стаяць побач Вінцэнт Ван Гог у саламяным капелюшы і зорка хіп-хопа ў падраных джынсах і залатых ланцугах. Першае, чым здзіўляюць “Метамарфозы”, — разнастайнасць тэм і вобразаў. Тут і класічныя пяць стыхій: на мадэлях струменістая, як вада, спадніца і кашуля ў палымяна-рыжых валанах. Узбоч — біблейскія сем грахоў: самалюбства з паўлінавым пер’ем, сквапнасць у сукенцы з банкнот і рагах залатога цяльца. Асабліва ўразіла зайздрасць, упрыгожаная мноствам папяровых “вочак”, каб заўважаць чужыя поспехі. За цікавую знаходку аўтар калекцыі атрымала спецыяльны прыз.

Іншая крайнасць — паказы, што перадаюць настрой неадназначнай і супярэчлівай сучаснасці. Аўтар калекцыі “Граф-хоп”, здаецца, пасмейваецца з моднай сёння рэп-культуры і хіпстарскай моладзі. Адразу два дызайнерскія праекты былі прысвечаны серыялу “Гульня прастолаў” — відаць, будучым настаўнікам добра знаёмы сучасныя трэнды. Суровая калекцыя “Бурай народжаная” адлюстравала няспынную гонку за ўладай, а шыкоўная “Песня лёду і полымя” — багацце і раскошу, якія атрымае пераможца.

Парадавала, што ў гэтым годзе ўдзел у “Метамарфозах” узялі і школьнікі. Маленькія мадэлі і дызайнеры сталічнай сярэдняй школы № 217, гімназіі № 75 і Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Эўрыка” Фрунзенскага раёна Мінска прадэманстравалі ўласныя калекцыі. Фестываль быў прысвечаны Году малой радзімы, таму ўсе дэфіле атрымаліся з мяккімі ноткамі этнастылю. Дзеці пакуль выступалі па-за конкурсам, але варта крыху падрасці — і яны змогуць скласці канкурэнцыю студэнтам, тым больш што папулярнасць фестывалю расце з кожным годам.

— Калі ў 2016 годзе мы сабралі восем дызайн-каманд, то сёння ўдзельнічалі чатырнаццаць, — з гордасцю расказвае дэкан факультэта эстэтычнай адукацыі Ірына Іванаўна Рыжыкава.

Больш за ўсё Ірына Іванаўна цэніць фестываль за тое, што ён аб’ядноўвае ўвесь факультэт: пакуль адны ствараюць касцюмы, іншыя рыхтуюць творчыя нумары для святочнага канцэрта. І ўсё са шчырым захапленнем, уласцівым толькі сапраўды зацікаўленым маладым творцам. Менавіта такое ўражанне стварае ўдзельніца конкурсу студэнтка трэцяга курса спецыяльнасці “Выяўленчае мастацтва і камп’ютарная графіка” Алеся Федаровіч, якая яркую тканіну для сваёй вопраткі стварыла са звычайнай сеткі з-пад агародніны, а чорныя рукавы-крылы — з відэакасетнай стужкі.





Калекцыю “Каралеўства моды” складана ўявіць асобна ад дынамічнага дэфіле. Танцы спалучаліся з акрабатычнымі элементамі і падкрэслівалі ідэю тоеснасці класічных і сучасных уяўленняў аб прыгажосці. А напрыканцы паказу мадэлі і ўвогуле заспявалі. Такім чынам, выступленне дызайнерскай каманды Алесі аб’яднала адразу тры віды мастацтва — дызайн, танцы і спевы. Заслужаная ўзнагарода — дыплом I ступені.

Гран-пры фестывалю атрымала казачная калекцыя “АЛісА” Лізаветы Вашкевіч, студэнткі другога курса спецыяльнасці “Музычнае мастацтва, рытміка і харэаграфія”. З тэмай калекцыі дзяўчына вызначылася хутка — літаратурны талент Льюіса Кэрала. Падчас падрыхтоўкі дызайнер стала пастаянным пакупніком у гаспадарчым магазіне. Напрыклад, звычайная вяроўка на каркасе з кавалкаў плінтуса — галоўная частка касцюма Чырвовай Каралевы. Тая ж вяроўка на тэлевізійным кабелі — і гатовы цыліндр Шалёнага Капялюшніка. Але галоўны кампанент кожнага вобраза — фантазія.

З Лізай мы размаўлялі ў той час, калі журы абмяркоўвала сваё рашэнне, таму яна яшчэ не ведала, што праз дзесяць хвілін будзе трымаць у руках галоўны прыз, а яе словы стануць добрай парадай для ўдзельнікаў наступных “Метамарфоз”.

І арганізатары фестывалю, і члены журы падкрэсліваюць адну думку: ад маладых творцаў чакаюць арыгінальнага выказвання. Няважна, ці то дызайнер прыдумвае авангардную калекцыю, ці то настаўнік складае план адкрытага ўрока. Уменне выкарыстоўваць свой крэатыўны патэнцыял, каб адказваць на цікавыя выклікі, — вось першая прымета творчага падыходу. Хочацца верыць, што ўдзельнікі “Метамарфоз” атрымалі асалоду ад вырашэння такой складанай задачы і змогуць яшчэ не раз адчуць такое ж задавальненне — і на наступным універсітэцкім фестывалі, і ў школьных класах.

Мар’я ЯНКОВІЧ.
Фота аўтара.

Сумесная даследчая праца бацькоў і дзяцей з’яўляецца найкаштоўнейшым інструментам фарміравання сямейных адносін, а таксама выпрацоўкі даследчых кампетэнцый. Разгледзім такое ўзаемадзеянне на прыкладзе стварэння вучаніцай 8 “А” класа сярэдняй школы № 186 Мінска Валерыяй Млынчык і яе бацькамі Дзмітрыем Валянцінавічам і Таццянай Аляксандраўнай праекта “Распрацоўка экскурсійнага маршруту па месцах памяці ахвяр лагера Трасцянец”.

Складаем маршрут разам з бацькамі

У даследчай дзейнасці вучняў бацькі могуць выступаць адначасова ў некалькіх ролях. Яны забяспечваюць найбольш зручны рэжым працы, адпачынку і харчавання дзіцяці, кансультуюць, адсочваюць выкананне плана, падтрымліваюць матывацыю і развіваюць самастойнасць дзіцяці, вырашаюць аператыўныя пытанні, дапамагаюць у папярэдняй ацэнцы вынікаў даследавання, удзельнічаюць у падрыхтоўцы прэзентацыі.

На этапе выбару і фармулявання тэмы праекта бацькі Валеры былі ў якасці памочнікаў. Выбар тэмы праекта абгрунтоўваўся знаходжаннем тэрыторыі былога лагера Трасцянец у сучасным мікрараёне Шабаны, дзе жыве сям’я Млынчык. Лера і яе бацькі вырашылі азнаёміцца з гісторыяй лагера і распрацаваць пешаходны маршрут па месцах памяці ахвяр лагера, каб расказваць пра трагедыю, якую перажылі тысячы людзей.

На першапачатковым этапе бацькі дапамагаюць дзіцяці правільна сфармуляваць задачы, вызначыць, наколькі яму па сілах выканаць тое, што плануецца. У выніку працы Валеры і яе бацькоў былі сфармуляваны тры задачы: вывучыць на аснове навукова-папулярнай і энцыклапедычнай літаратуры прыёмы распрацоўкі і арганізацыі экскурсійнага маршруту; на аснове вывучэння інфармацыі аб лагеры Трасцянец вызначыць напаўненне экскурсійнага маршруту; даведацца пра мерапрыемствы, якія праводзяцца дзяржавай па ўшанаванні памяці ахвяр Трасцянца.

Бацькі адыгрываюць ролю крыніцы інфармацыі нароўні з кнігамі, інтэрнэтам і інш., дапамагаюць працаваць з літаратурай, праяўляюць зацікаўленасць да працы дзіцяці. Падчас даследавання Лера і яе бацькі працавалі з энцыклапедычнай і навукова-папулярнай літаратурай і інфармацыяй у інтэрнэце, сістэматызавалі яе і аналізавалі, параўноўвалі картаграфічны і ілюстрацыйны матэрыялы, займаліся апісаннем аб’ектаў экскурсіі, а таксама гістарычнай і лагічнай рэканструкцыяй яе зместу.

Пры распрацоўцы плана і структуры даследавання бацькі дапамагаюць размеркаваць работу дзіцяці з улікам яго занятасці, ствараюць умовы для выканання гэтага плана. Складзены Лерай і яе бацькамі план разбіваў аб’ём работы на часткі і вызначаў тэрмін выканання кожнай. Імі былі таксама складзены праграма і каляндарны план выканання даследавання. Строгая арганізацыя ў выніку дазволіла зрабіць працу аператыўна.

Дапамога бацькоў была важнай для Валеры і на этапе пошуку і азнаямлення з аб’ектамі лагера Трасцянец. Дарослыя дапамагалі дзіцяці рухацца па маршруце, шукаць аб’екты па тэме даследчай працы. На аснове вывучанай літаратуры былі вызначаны некалькі этапаў вывучэння гісторыі лагера смерці Трасцянец і падрыхтоўкі экскурсіі. Па-першае, быў арганізаваны пошук аб’ектаў для экскурсіі, якія вывучаліся па літаратурных крыніцах, а таксама адбывалася знаёмства і вывучэнне аб’ектаў на месцы іх існавання. Па-другое, апрацоўвалася сабраная інфармацыя і былі вызначаны аб’екты для экскурсіі. Па-трэцяе, на аснове сістэматызаванай інфармацыі быў складзены маршрут экскурсіі і падрыхтаваны інфармацыйны матэрыял. На чацвёртым этапе яны прайшліся па маршруце экскурсіі, склалі яго тэхналагічную карту і інфармацыйны лісток. На заключным этапе была падрыхтавана змястоўная рэканструкцыя экскурсіі для экскурсавода (кантрольны тэкст) і адабраны выяўленчы матэрыял для партфеля экскурсавода.

Пры афармленні даследчай работы школьніку можа спатрэбіцца дапамога бацькоў у рэдакцыйнай праўцы, граматычным і стылістычным кантролі. Па выніках выканання працы рыхтуецца справаздача і публічная прэзентацыя. На гэтым этапе бацькі могуць дапамагчы аформіць прэзентацыю, а таксама зняць хваляванне перад выступленнем-абаронай. Даследчая праца заканчваецца ацэньваннем як атрыманых вынікаў, так і вынікаў сумеснай дзейнасці. Традыцыйна бацькоў запрашаюць на канферэнцыю па падвядзенні вынікаў даследчай працы за год у нашай школе. Таты і мамы даюць парады, якія дапамогуць скарэкціраваць работу дзяцей у праекце, абмяркоўваюць, што можна зрабіць самім, без дапамогі бацькоў.

Мэтай супрацоўніцтва педагогаў, навучэнцаў і бацькоў з’яўляецца стварэнне нефармальнай, сяброўскай атмасферы жыццядзейнасці школьнікаў, эфектыўнай сувязі школы і сям’і ў выхаванні і адукацыі дзяцей. Даследчая праца не толькі адкрывае тэму, але і задае арыенціры для сумеснай дзейнасці бацькоў і дзяцей. Вопыт паказвае, што таты і мамы зацікаўлены ў сумеснай творчасці з дзіцем.

Галіна ГЕРАСІМОВІЧ,
настаўніца музыкі;
Яўген ЛУФЕРЧЫК,
намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце
сярэдняй школы № 186 Мінска.